1. Основной текст написан крупным шрифтом, располагается чуть выше середины, цвета контрастные;
2. Удачные сочетания цветов, способствующие привлечению внимания читателя и благоприятной учебе;
3. Наличие персонажей и \ или красочных иллюстраций;
4. Чаще всего рисунки простые, без большой детализации;
5. Оформление привлечет внимание как юного читателя, так и родителей.

## Литература

1. Влияние цвета на настроение человека [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.ch-smi.by/vliyanie-cveta-na-nastroeniecheloveka. – Дата доступа: 24.06.2022.
2. Все изображения изданий. Аверсэв [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.aversev.by/katalog. – Дата доступа: 30.06.2022.
3. КомпьютАрт [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://compuart.ru/article/2490.9. – Дата доступа: 24.06.2022..
4. *Цыганков, В. А.* Две школы – два стиля / В. А. Цыганков // Бизнес и дизайн ревю. – 2016. – Т. 1. – № 3. – С. 13.

*Т. А. Астапчык (Беларусь)*

# «НАПРАДВЕСНІ»: СТУДЭНЦКІЯ ВЕРШЫ МІКОЛЫ ШАБОВІЧА

У 2021 г. пабачыла свет апошняя прыжыццёвая кніга беларускага паэта Міколы Шабовіча «Пад маміным крылом...», куды ўвайшлі выбраныя творы, напісаныя на працягу 45 гадоў літаратурнай дзейнасці. Асобны раздзел кнігі склалі студэнцкія вершы, сабраныя ў нізцы «Напрадвесні». Першыя сур'ёзныя крокі будучага вядомага паэта прадстаўляюць сабой надзвычай важны і цікавы аб'ект для аналізу.

Сама назва, пад якой аб'яднаны студэнцкія творы Міколы Шабовіча, невыпадковая, сімвалічная: яна сведчыць пра тое, што вось-вось надыдзе вясна – як для паэта (час росквіту паэтычных памкненняў, рэалізацыі шматграннага таленту), так і для ўсёй беларускай літаратуры, у якую прыйшоў вытанчаны лірык з бездакорным адчуваннем роднай мовы. У вершах студэнцкіх гадоў выразна абазначыліся і арыгінальна раскрыліся наступныя тэмы: Вялікая Айчынная вайна; малая радзіма; каханне.

Вершы «Лес», «Чатырнаццаць», «Радзіма мая...», «Вясна прыходзіць нетаропка...» прасякнуты надзвычай вострым перажываннем мінулай вайны, глыбокім разуменнем маштабу страт, разбурэнняў, ахвяр. Сляды вайны бачацца паэту і ў дрэвах роднага лесу: *«А лес як шпіталь салдацкі, / Дзе мажна рыпіць пратэз. /*

*Для некага лес як дача, / А мне ты як памяць, лес. / А мне ты й цяпер гаворыш / Пра ночы і дні вайны, / Калі падымаліся ўгору / Ад елкі і да сасны»* [1, с. 277]. Яркія метафары, параўнанні ўзбагачаюць мастацкую тканіну верша, абвастраюць напружанае, узрушлівае гучанне радкоў: *«А мы іх сякерай, пілою, / Як вылюдкаў – у агонь... / І коцяцца слёзы смалою / На цёплую печы далонь..»* [1, с. 277]. У вершы лес паўстае як паплечнік паэта, носьбіт цяжкіх і светлых дум, маўклівы сведка, захавальнік жахаў мінулай вайны. Чатырнаццаць аднавяскоўцаў Міколы Шабовіча (родная вёска Бадзені Мядзельскага раёна Мінскай вобласці) загінулі ў баі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Ім прысвечаны верш «Чатырнаццаць» (1978), у якім знайшлі ўвасабленне і шчырая, бязмежная ўдзячнасць дзевятнаццацігадовага паэта за мірнае неба, і абсалютна рэалістычнае (на мяжы з адчаем) разуменне пачварнасці, жорсткасці вайны і незваротнасці жыццяў, лёсаў тых чатырнаццаці: *«Стаю ля абеліска, бы ў агні, / Мне з думкамі нялёгка развітацца. / Насупраць – у гранітнай цішыні – / Мае аднавяскоўцы, чатырнаццаць...»* [1, с. 279]. Водгулле той вайны, яе пячатка на мірным жыцці паўсюль бачацца маладому паэту, і гэта напаўняе асаблівай адказнасцю перад тымі, хто не вярнуўся: *«Я стаю ля Агню. / Навакол – лістапад. / І здаецца: вайны / Агнявеюцца вёрсты. / І мне кажа салдат, / Невядомы салдат, / Каб з сабою пранёс / Боль бярозы чацвёртай»* [1, с. 287]. Дадзенае абяцанне, з аднаго боку, прыносіць цяжар абавязку, неадступнага фонавага болю, а з другога – назаўжды вылечвае ад бессэнсоўя, пустэчы, мітусні, узвышае і аздараўляе душу: *«Я ўсё споўню, салдат. / Пранясу ў душы / Гэту просьбу як вернасць / Абранай дарозе. / Нехта скажа: ты лепей / Пра шчасце пішы... / Я пішу. Ну а думкі – / Ля той жа бярозы»* [1, с. 287]. У сённяшні неспакойны час прароцкімі бачацца напісаныя ў 1981 г. радкі: *«Хоць не спыняецца ўзбраенне / І дзесьці чуюцца пагрозы, / Але з акопаў, на здзіўленне, / Да сонца цягнуцца бярозы»* [1, с. 287]. Узнятая ў студэнцкія гады тэма вайны знойдзе працяг у кнізе Міколы Шабовіча «Падары мне сваю адзіноту» (2002) (вершы «Званы», «Не бачыў я праклятай той вайны...», «Вечны агонь»).

Родная вёска Бадзені, Мядзельшчына, Нарач трывала ўвайшлі ў творчую спадчыну паэта. Такія творы студэнцкіх гадоў, як «Мой край» (1980), «Выпраўляемся ў сто дарог...» (1980), «Хоць не бачыў чужых краін...» (1981), «Колькі разоў я вяртаюся...» (1981), «Надзей спакуслівых маршрут...» (1981), напоўнены шчырым замілаваннем і вернасцю роднай зямлі. Малая радзіма паэта – гэта народжаны ў песнях край, дзе *«салаўі аж захліпаюцца»* [1, с. 281], *«пяшчотна хваліцца-хвалюецца і прыгажосцю вабіць Нарач»* [1, с. 281], *«жыты шапочуцца з палямі»* [1, с. 282], а *«кароўкі божыя варожаць толькі на пагоду»* [1, с. 282]. Дарэчы, верш «Мой край» стаў вядомай песняй, своеасаблівым гімнам Мядзельшчыны (музыка – А. Малашчыцкага). Сыноўняя адданасць, бясконцая любоў да родных мясцін дазваляюць паэту пранізліва паказаць і балючыя вясковыя рэаліі. Захапленне, пяшчота і ўдзячнасць сваёй малой радзіме непарыўна знітаваны з глыбокім болем за родную вёску, якая *«затрымаць сыноў не зможа»* [1, с. 289]: *«Зноў ад'езд, адыход, адлёт – / Распрамляем навыцяж крылы... / Б'ецца маці як рыба аб лёд, / Вёска вочы рукою прыкрыла...»* [1, с. 282–283]. На вачах паэта пусцее *«край рабін,*

*край азёр, край буслоў»* [1, с. 286], усё менш двароў і жыхароў у роднай вёсцы: *«Пасохлі вербы ля ракі, / І хата выстылая стыне... / А птушкі кормяцца з рукі / Апошняй, можа, гаспадыні»* [1, с. 289]. Вёска, якая памірае, прыцягвае ўвагу чытача на многіх старонках паэтычнай спадчыны Міколы Шабовіча. Закранутая ў студэнцкія гады тэма малой радзімы знойдзе працяг у кнізе «Падары мне сваю адзіноту» (2002) (вершы «Мой востраў», «У нашай вёсцы – трыццаць тры двары...», «Дзед Пракоп», «Прапіска», «Вяртанне», «Ападаюць з бяроз лісты...», «Да сёмага неба, туды, на вяршыню...»). У зборніку «Маладыя мроі маладога лета» (2017) ёсць асобны раздзел пад назвай «З бадзенеўскага сшытка» – арыгінальны вершаваны рэпартаж з эпіцэнтра жыцця паэта, з роднай вёскі.

Тэма кахання таксама прадстаўлена ў студэнцкай лірыцы Міколы Шабовіча. Шчымліва, шчыра паэт дакранаецца словамі да гэтага пачуцця. Вялікую цікавасць выклікае верш з яскравым сюжэтам «Суніцы» (1977), раскрыццю якога спрыяюць уведзеныя ў тэкст дыялогі, тэмпаральная лексіка: *«На ранку, усё-ткі знайшоўшы выйсце, / Дахаты прыйшлі мы нясмелыя. / Пытаецца маці: «А дзе ж суніцы?» – / «Эх, мама, яны ж – няспелыя...»«* [1, с. 278]. Сюжэтам адметны і верш «Нараджэнне кахання» (1980). Некалькі строф лірычна і дынамічна паказваюць цэлы адрэзак жыцця (хлопчык, які знайшоў і выратаваў прымерзлае шчаня / юнак, які спаткаў каханую): *«Але паўз лес гуляючы вясновы, / Яны дзяўчыну напаткалі раптам, / І гаспадар у хату леснікову / Пайшоў за ёй, пакінуўшы сабаку. / А ён у вокны кідаўся да рання, / Не мог разважыць галавой сабачай, / Што гэта нараджалася каханне, / Што гэта прачыналася юнацтва»* [1, с. 284]. Сярод студэнцкіх вершаў пра каханне ёсць і два верлібры – «Яны настолькі верылі ў каханне...» (1980), «Вядома, ты помніш...» (1980). Перад чытачом разгортваецца невымоўная чысціня памкненняў закаханых, увасобленая ў беражлівых, шчырых, трапяткіх адносінах: *«Яны настолькі верылі ў каханне, / Самае чыстае, па-юначы светлае, / Заўсёды маладое, / Што ні адзін з іх / Ні на хвіліну / Не мог нават падумаць / Пра нейкую фізічную блізкасць, / Як не можа падумаць птушка / Пра будаўніцтва метро, / Як не можа падумаць дрэва / Пра вынішчэнне лясоў. / І яны развіталіся. / Развіталіся, / Каб кахаць»* [1, с. 284–285]. У закаханых ёсць сваё дрэва, сведка іх непаўторнай гісторыі: *«Колькі разоў мы прыходзілі сюды / Па адным і разам, / Колькі тут было пеpажыта, перадумана... / Нашаму дрэву мы давяралі ўсё...»* [1, с. 285]. Абранае дрэва становіцца сапраўдным цэнтральным персанажам сюжэтнага верша «Вядома, ты помніш...»: *«Амаль год я не быў каля дрэва, / Столькі ж – ты. / Амаль год мы не можам да канца разабрацца, / Хто ж вінаваты: я, ты ці тое дрэва, / Трапяткая прыгожая асіна...»* [1, с. 285]. Каханне – скразная тэма лірыкі Міколы Шабовіча. Які б перыяд жыцця лірычнага героя ні паўставаў перад чытачом, радкі паэта заўжды перапоўнены шчымлівасцю, светлым сумам, чысцінёй, замілаваннем, суцяшэннем. У нізцы «Напрадвесні» сустракаем і студэнцкія рэаліі (круглы ліхтар каля інтэрната, заспаная вахцёрша, немагчымасць дастаць білеты ў тэатр). Паэт бездакорна-трапна звяртаецца і да лексічных, і да сінтаксічных сродкаў стварэння вобразнасці: *«Святлафор той, нібы на заставе варта, / Пазірае вачыма суровымі прадзеда. / Пастаю.*

*Усё роўна ва ўсе тэатры / Білеты даўно прададзены. / Без цябе не магу пахінуцца нікуды...»* [1, с. 280].

Рэха мінулай вайны, яе след у мірным жыцці; малая радзіма, *«край нарачанскіх рабін»* [1, с. 286]; тая адзіная, без якой немагчыма нікуды пахінуцца, а панад усім гэтым – цеплыня бездакорных паэтычных радкоў, што саграваюць заінелыя душы чытачоў. Паэзія Міколы Шабовіча адметная тым, што яна наскрозь прасякнута шчырасцю, чэснасцю, непрыманнем фальшу і пафасу. Ужо ў студэнцкія гады выразна гучыць крэда паэта: *«Я быў бы чысты, нібы шкло. / О, як чысцюляў не люблю я! / Хай нехта шчырасцю гандлюе – / Я не хаваю, што было. / Я не хаваю. Што хаваць?! / Я не хачу здавацца лепшым, / А я жыву і пешчу вершы, / Мне з імі плакаць і спяваць...»* [1, с. 291]. Невыпадкова завяршае нізку «Напрадвесні» «Незаімглёная вясна...» (1981): *«Незаімглёная вясна, / Сузор'е Веры і Надзеі... / А стрэхі плачуць давідна. / Як у Бадзенях»* [1, с. 291]. Як у Бадзенях – планка, на якую раўняцца, вышыня, да якой цягнуцца...

Такім чынам, нізку студэнцкіх вершаў Міколы Шабовіча «Напрадвесні» тэматычна можна прадставіць трыма словамі: вайна, Радзіма, каханая. Заяўленыя тэмы знойдуць лагічны працяг у наступных кнігах паэта («Падары мне сваю адзіноту» (2002), «Мая надзея» (2006), «Маладыя мроі маладога лета» (2017)). Не толькі непаўторны лірык, але і выбітны мовазнаўца, Мікола Шабовіч асцярожна, паважліва і адначасова па-майстэрску смела абыходзіцца са словамі роднай мовы, аздабляючы свае вершы непаўторным гукапісам, элементамі экспрэсіўнага сінтаксісу, яркімі метафарамі, арыгінальнымі параўнаннямі, аксюмаранамі, аказіяналізмамі. Бездакорнае валоданне беларускім словам і паэтычны талент утвараюць гэты чароўны лірычны вянок.

## Літаратура


1. *Шабовіч, М. В.* Пад маміным крылом... : выбр. творы / М. В. Шабовіч. – Мінск : Маст. літ., 2021. – 303 с.



*О. А. Баркович (Беларусь)*


# НЕКОТОРЫЕ МОРАЛЬНО-НРАВСТВЕННЫЕ АСПЕКТЫ ПРИ ОБУЧЕНИИ ОСНОВАМ ВЫСШЕЙ МАТЕМАТИКИ

В XXI веке многие открытия были сделаны на основе глубинного понимания взаимосвязи идей высшей математики с основами других наук. Будущим психологам важно научиться проводить анализ больших баз данных, выявлять